# «Падарожнік»

## Комікс пра вандроўку Вацлава Ластоўскага



У лістападзе 1926 года адбылася знакавая падзея — Акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу, якая сабрала мовазнаўцаў не толькі з БССР, але і з замежжа.

Гэта быў самы разгар палітыкі «беларусізацыі», калі ў краіне разгарнулася кіпучая праца па стварэнні ўсяго беларускага: выходзілі кнігі, газеты і часопісы на беларускай мове, працавалі музеі і тэатры, здымалася кіно.

Статус культавых аўтараў на той час мелі Янка Купала і Якуб Колас. Але вырасла і новае пакаленне літаратараў, якія згуртаваліся вакол аб'яднання «Маладняк». Галоўнымі завадатарамі там былі Міхась Чарот і Алесь Дудар, якія нярэдка «браліся ў рожкі» з класікамі.

Менавіта згаданая канферэнцыя падштурхнула Вацлава Ластоўскага, які жыў тады ў Коўне, да пераезду ў БССР. Былы прэм'ер-міністр БНР, які добра праявіў сябе на культурніцкай і навуковай ніве, меў некалькі варыянтаў для пераезду.

Але вырашыў вярнуцца ў Савецкую Беларусь…


Коўна, восень 1925 года
Падарожнік
Я клункі ўжо злажыў
Тук Тук
Вы грамадзянін Ластоўскі? Для вас карэспандэнцыя з Менска!
Для мяне? Вы ўпэўненыя?
Напісаны вашыя імя і адрас...
Цікава...
ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ
АКАДЭМІЧНАЯ КОНФЭРЭНЦЫЯ ПА РЭФОРМЕ ПРАВАПІСУ І АЗБУКІ
БІЛЕТ
ПАКАЗЧЫК ГЭТАГА гр. Ластоўскі В.
ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА УДЗЕЛЬНІКАМ АКАДЭМІЧНАЕ КОНФЭРЭНЦЫІ ПА РЭФОРМЕ БЕЛАРУСКАГА ПРАВАПІСУ І АЗБУКІ
СТАРШЫНЯ ІНСТЫТУТУ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ Ў. Ігнатоўскі
НАВУКОВЫ СЭКРАТАР
14 ЛІСТАПАДА 1926
Няўжо праз столькі гадоў пабачу родную Беларусь?


Коўна, лета 1926 года. Кавярня, дзе збіраюцца беларусы
PREKES
PRODUKTY
О, зноў Ластоўскі кудысьці едзіць. Нябось у Парыж нейкі ці Цюрых...
А вы што, панове, не чулі, што Ластоўскі едзе ў Менск?
Былы міністр БНР ды ў Саветы?! Маніш!
І хто ж яму візу зрабіў?
Кажуць, самі Саветы і запрасілі!
Але ці вернецца потым?
Ці захоча вяртацца?


Рыга. Вакзал
RIGA
Вацлаў, вітаем у Рызе!
Ці ты праўда едзеш у Менск? Не баішся?
Там жа цяпер камуністы, а ты не камуніст.
Ведаеш, дзядзька, цікава паглядзець, як Беларусь жыве.
Ці вы ўпершыню ў Рызе, пан Ластоўскі?
Не, я нават 20 гадоў таму, як быў маладзейшым, чытаў тут лекцыі па беларускай мове і культуры!
Тады яшчэ нічога ў беларусаў і не было свайго!
Хадзем, яшчэ будзе час паразмаўляць. У нас насычаная праграма — агляд горада, знаёмства з мясцовым беларускім рухам, сяброўская вечарына.
А заўтра пасадзім цябе на цягнік да Віцебска.
Добра-добра.



Савецкая мяжа
А вось і Бацькаўшчына!
Ян Райніс
БІГОСАВА СССР
Обмен валют!
На дзіва мастацка выкананая манета!
ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН СОЕДИНЯЙТЕСЬ
С.С.С.Р.
Так, але гэтая манэта нам кажа, што мы ўязджаем у дзяржаву, дзе пануючай мовай ёсьць мова маскоўская!
Панове, цішэй! Памежнікі побач!


Каля Полацка
Сябры, вось гляджу я на Полацк, і ў думках усплываюць усе славутыя старонкі нашай гісторыі. І як жа балюча ад таго, что наш народ заняпаў так глыбока...
Так, некалі калыска беларускай дзяржаўнасці, цяпер памежны горад.
Не пашанцавала ж нам апынуцца ў ліку тых народаў, якіх па-жывому дзеляць такім вось чынам!
Але ж не ўсё страчана. Беларусь прачынаецца па абодвух баках мяжы. Мабыць, аднойчы яна зноў адродзіцца...
Вашыя словы нагадваюць мне вашыя «Лябірынты». Цудоўная фантастычная аповесць! Раней і не памятаю, каб такое нешта чытаў!



Раніцай
ВІЦЕБСК
Хадзем у буфет, пачакаем цягніка на Менск.
?
БУФЕТ
Якуб Колас
·Маці·
56
Ты паглядзі...
Хадзем, дзядзька! Цягнік ужо на пероне!



Менск. Берасцейскі вакзал
Вітаю старых знаёмых у Менску, цэнтры ўсіх беларускіх земляў!
Аляксандр Цвікевіч
Паўліна Мядзёлка
Панове, хадзем да аўтобусаў! Вы, напэўна, стаміліся з дарогі
Уладзімір Пракулевіч
А дзе мы будзем жыць?
Вас адвязуць у гасцініцу, якая даўней звалася “Эўропа”. Ведаеце такую?
Ого, вось гэта прыём!
Уга!
АКАДЭМІЧНАЯ КОНФЭРЭНЦЫЯ ПА РЭФОРМЕ БЕЛАРУСКАГА ПРАВАПІСУ І АЗБУКІ 14–26 ЛІСТАПАДА


За некалькі дзён да канферэнцыі
ДОМ АСЬВЕТЫ
20 гадоў творчае дзейнасьці Якуба Коласа
Даўно не бачыліс́ь, дзядзька!
Янка Купала
Ба, пан Купала, стары сябар! Колькі год! Як пачуваеш сябе?
Быццам бы няблага, але часам дыхаць цяжка...
Хіба прастуда мучыць?
І яна таксама. Але што з мяне, я чалавек ужо немалады. Вон паглядзі, ідзе новае пакаленне!
Хіба маладнякоўцы?
Яны!


Вітаем, шаноўнае старэйшае пакаленне!
Міхась Чарот
А вы як, арляняты?
Жывем, хлеб жуем.
Што, хлопцы, любіце Беларусь?
Любім, але ў нас з вамі розныя Беларусі. Вы любіце Беларусь старую, крывічанскую, мы — новую, пралетарскую.
Беларусь болей слухаць не хоча аб Рагнедзе і Ізяславе.
Трынаццатай песняй прарочу Беларусі лапцюжнай славу...
Беларусь болей слухаць не хоча Аб Рагнедзе і Ізяславе.
Не кажу аб дзікунскай навале,
Ні аб царскім і панскім прыгоне...
Беларусь на крутым перавале, —
Нараджаецца вольнай сягоння.
Гэта маё новае, паэма хутка будзе!
А вашыя часы мінулі, класікі!
Як і Коласаў усялякіх!


Святочны вечар у адной з менскіх сталовак з нагоды 20-годдзя творчай дзейнасці Якуба Коласа. Лістапад 1926 года
Цішка Гартны
Антон Баліцкі
Якуб Колас
Ведаеш, мяне сёння вельмі ўразілі гэтыя “маладнякоўцы”. Я толькі яшчэ не разабраўся як — кепска або добра…
А, гэтыя. Бяруцца ў рожкі немаведама чаго з намі …
Але ж цікава, што беларуская моладзь абуджаецца, робіцца актыўнай і пасіянарнай.
У нашыя часы такога не было!
Тут яшчэ і не такія “казкі жыцця” адбываюца.
Не так даўна толькі цудам абмінуў цугундар праз такую вось актыўную моладзь…
Гэта ты, дзядзька, хіба “лістападаўцаў” маеш на ўвазе? Я пільна сачыў за справай Лістапада ў прэсе!
Па замежжы быў вялікі розгалас.
Быў і добра. Але давай лепей зменім тэму…
Але ж усё скончылася не так і кепска, здаецца.
Скончылася і скончылася …


Менск, 14 лістапада 1926 года
АКАДЭМІЧНАЯ КОНФЭРЭНЦЫЯ
Ты як у Празе?
Нармальна! А ты, чуў, у Вільні жывеш. І як там цяпер?
А ведаеш, цярпіма!
Уладзімір Жылка
Таварышы! Таварышы! Хвілінку ўвагі! Хутка пачынаем!
...дарагія беларусы, рады вітаць вас усіх у гэтых сценах!
Усевалад Ігнатоўскі
Адвеку мы спалі, і нас разбудзілі!...


Ну як вам у Менску?
Ведаеце, а мне падабаецца. Горад, вядома, не такі сучасны, як хацелася б, але ж...
Аляксандр Чарвякоў
Дык, можа быць, варта перабірацца? Што вам тая Літва? А тут... Універсітэт, Інбелкульт, музеі, тэатры, часопісы, газеты. Беларусізацыя!
Самі ж усё бачылі!
Бачыў! Але ж я не камуніст...
А вам і не трэба, дастаткова быць “попутчиком”.
Бачыце, Аляхновіч ужо і савецкае грамадзянства збіраецца атрымаць. Малады паэт Жылка таксама хоча да нас.
Дык і вы падумайце! Нам вельмі не хапае кадраў!
А з вяртаннем мы калі што дапаможам!
Я... я падумаю!
Абавязкова падумаю...






Увесну 1927 года Вацлаў Ластоўскі пераехаў у Менск. Там працаваў у Інбелкульце, быў дырэктарам музея, стаў неадменным сакратаром толькі што створанай Акадэміі навук.

Летам 1930 года арыштаваны разам са Сцяпанам Некрашэвічам. Адпраўлены ў высылку ў Саратаў.

У жніўні 1937 года паўторна арыштаваны і расстраляны ў студзені 1938 года. Месца пахавання невядомае, як і многіх іншых герояў гэтага комікса.

Рэабілітацыя Вацлава Ластоўскага пачалася ў 1958 годзе. У званні акадэміка ён быў адноўлены толькі ў 1990 годзе.